ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1980 г.
23 КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 27 (1291)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ТЭЛЕТАЙП

### ПРАВЕДЗЕНЫ СЕМІНАР

з дэканамі факультэтаў і загадчыкамі кафедр па абмену вопытам прымянення тэхнічных сродкаў навучання, аўтаматызаваных навучальных сістэм на базе ЭВМ.

На семінары заслухана інфармацыя прадстаўнікоў усіх факультэтаў, агульнауніверсітэцкіх кафедр і кафедр ІПК. У ходзе семінара ўдзельнікі пазнаёміліся з АНС, АТНС (аўтаматызаванай тэлевізійнай навучальнай сістэмай), навейшым лабараторным абсталяваннем.

А. ВАЛАТО.

### РАСПРАЦАВАНА СІСТЭМА

аўтаматызаванага апытання студэнтаў пры выкананні работ фізічнага практыкума на кафедры агульнай фізікі. Яна прымяняецца для забеспячэння франтальнага метаду правядзення лабараторных заняткаў па курсу «Асновы радыёэлектронікі» і «Ядзерная электроніка».

М. ГУШЧО.

### АРГАНІЗАВАНЫ КУРСЫ

па падрыхтоўцы кінадэманстратараў з ліку выкладчыкаў і вучэбна-дапаможнага персаналу кафедр БДУ імя У. І. Леніна.

Слухачамі курсаў сталі Г. Г. Красякова — інжынер кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл, А. А. Кажэлінава — старшы лабарант кафедры мацерыкоў і акіянаў, Л. В. Марцыёнка — лабарант кафедры тэлебачання і радыёвяшчання, К. Р. Лялькевіч — інжынер кафедры крыміналістыкі.

І. ШУКЕВІЧ.

### ЛЕНІНІЯНА Ў МІНІЯЦЮРНЫХ

выданнях паступіла ў аддзел рэдкіх і каштоўных кніг бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта. У цудоўна ілюстраваных і якасна выдадзеных кніжках змешчаны пісьмы камуністаў і камсамольцаў Леніну, успаміны Н. К. Крупскай, нарысы аб правадыру сусветнага пралетарыяту.

А. СІНЬКЕВІЧ.

### СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫ

камсамольскі сход адбыўся на факультэце журналістыкі. Камсамольцы журфака падвялі вынікі работы за мінулы навучальны год, вызначылі новыя напрамкі ў сваёй дзейнасці.

Быў выбраны новы састаў камітэта камсамола факультэта, штаб «Камсамольскага пражэктара», рэдкалегія газеты «Журналіст». У іх састаў увайшлі лепшыя студэнты факультэта, якія добра сябе паказалі ў грамадскай дзейнасці.

На сходзе прысутнічаў сакратар камітэта камсамола універсітэта П. Брыгадзін. Ён уручыў камсамольцам Ганаровыя граматы за іх добрасумленныя адносіны да вучобы і грамадскай дзейнасці.

І. БАРДЗІЯН.

## НАША ПРАЦА ТАБЕ, ПЯЦІГОДКА!

ВОСЬ І ПАСТАЎЛЕНА кропка ў летапісе працоўнай студэнцкай пяцігодкі. Хочацца расказаць аб справах Шклоўскага зводнага студэнцкага сельскагаспадарчага атрада, у саставе якога працавалі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і геаграфічнага факультэта.

Усе байцы ССГА актыўна ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва пад дэвізам «Апошняму году пяцігодкі — — ударную працу, высокую прадукцыйнасць, эфектыўнасць і якасць работы студэнтаў».

### Вынікамі задаволены

У раёне было шмат зроблена для таго, каб лепш арганізаваць быт, адпачынак і працу студэнтаў. На бюро райкома камсамола былі разгледжаны і зацверджаны сумесныя мерапрыемствы РК ЛКСМБ і раённага штаба сельгасатрадаў, план работы штаба, распрацаванае штабам палажэнне аб сацыялістычным спаборніцтве сярод атрадаў раёна. Вялікую ўвагу пытанням размяшчэння студэнтаў, арганізацыі іх быту, адпачынку і работы аддавалі савецкія, партыйныя і сельскагаспадарчыя органы раёна. Так, райкам партыі правёў расшыраную нараду сакратароў партарганізацый, камандзіраў ССГА, на якой былі абмеркаваны пытанні, звязаныя з дзейнасцю сельгасатрадаў.

Тон у сацыялістычным спаборніцтве задавалі байцы сельгасатрада «Удачнік» ФПМ (камандзір В. Казачонак, камісар Л. Галавач).

Байцы «Удачніка» выступілі з каштоўным пачынам: працаваць так, каб на кожным рабочым месцы выконваць не менш чым паўтары нормы! І трэба сказаць, слова сваё яны стрымалі з гонарам — выконвалі штодзённа дзве нормы. Двойчы атрад выходзіў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва за сямідзёнку і ўзнагароджваўся пераходным вымпелам РК ЛКСМБ.

Трэба адзначыць, што рабяты з «Удачніка» (а гэта, між іншым, першакурснікі ФПМ!) цікава адпачывалі, выдатна арганізавалі атрадную работу. Так, агітбрыгада атрада дала 9 канцэртаў для працаўнікоў саўгаса «Рабочы». Лектары прачыталі 6 лекцый, рэдкалегія атрада выпусціла 6 нумароў насценгазеты, 24 «маланкі» і «баявых лісткі». У атрадзе рэгулярна праводзіліся палітінфармацыі. Студэнты ўзялі шэфства над ветэранамі вайны, адрамантавалі абеліск, зрабілі шмат іншых добрых спраў.

Другое месца ў сацыялістычным спаборніцтве заняў атрад «Мерыдыян» геафака (камандзір А. Вітчанка, камісар А. Занько), трэцяе — атрад «Юбілейны» ФПМ (камандзір С. Новікаў, камісар Л. Лапцёнак).

М. ФЯДЗЕНЯ,
камісар Шклоўскага занальнага атрада.

### РЭКОРД АТРАДА

НЕКАЛЬКІ ЗМЯНІЎШЫ класічны афарызм, можна сказаць, што няма нічога больш практычнага, чым добрая ідэя. Гэта думка стала дэвізам ССГА «Ідэя», які працаваў на ўборцы бульбы ў саўгасе «Советская Белоруссия» Чавускага раёна.

Студэнты выдатна папрацавалі на палетках саўгаса, перавыканаўшы план дагавора на 15 працэнтаў. Аднак для таго, каб атрымаць сапраўднае задавальненне ад работы, патрэбны ідэі. І такая ідэя была знойдзена: устанавіць рэкорд! Некалькі дзён камсамольска-маладзёжны экіпаж камбайна ў саставе Ю. Механіка, Б. Дзегцяра, В. Духоўнага, А. Валчонка сур'ёзна рыхтаваўся да рэкорда. І вось за адзін дзень 7 кастрычніка яны ўбралі бульбу з плошчы 4,6 гектара! За гэты высокі вынік членам экіпажа была аб'яўлена падзяка ад дырэкцыі саўгаса і ўручана грашовая прэмія.

Аднак не адзінай працай вядома наша студэнцтва. Прыемна было ўдзельнікам нашай агібрыгады пасля кожнага канцэрта чуць апладысменты, такія дружныя і шчырыя. Устаноўка радыёвузла ў школе і добраўпарадкаванне спортпляцоўкі, вялікая колькасць стэндаў, зробленых для саўгаса, школы, дзіцячага сада — гэта ж таксама патрэбна і важна!

Цалкам убраць ураджай, быць здаровымі, жыццярадаснымі — гэта і ёсць асноўныя ідэі атрада. І мы ўдзячны нашаму камандзіру за тое, што ён умела арганізаваў іх здзяйсненне.

Ю. ЧАРНАВУСАЎ,
камісар ССГА «Ідэя»
механіка-матэматычнага факультэта.

### СЛОВЫ ПАДЗЯКІ

СТУДЭНЦКІ сельскагаспадарчы атрад імя Дзмітрыя Іванова факультэта журналістыкі знаходзіўся ў калгасе «Серп і молат» Клімавіцкага раёна з 8 верасня па 10 кастрычніка 1980 года на ўборцы сельскагаспадарчых культур.

Адначасова з выкананнем вытворчай праграмы студэнты факультэта вялі вялікую масава-палітычную работу сярод працаўнікоў калгаса.

Праўленне калгаса просіць і ў далейшым накіроўваць студэнтаў факультэта журналістыкі для выканання сельскагаспадарчых работ у калгас «Серп і молат».

Сардэчна дзякуем усім студэнтам, якія прымалі ўдзел у аказанні дапамогі нашаму калгасу.

А. ПАЎЛАЎ,
старшыня калгаса
«Серп і молат»,
М. КАВАЛЁЎ,
сакратар
партарганізацыі.

## З ПАЗІЦЫІ ВЫСОКАЙ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦІ




Прынцыпова і зацікаўлена ў хутчэйшым рашэнні складаных задач вышэйшай школы ішла размова на справаздачна-выбарнай партыйнай канферэнцыі БДУ імя У. І. Леніна. І ў дакладзе партыйнага камітэта, і ў выступленнях камуністаў чырвонай стужкай праходзіла думка аб высокім абавязку і прызначэнні універсітэта ў жыцці грамадства. Праграмай дзеянняў для выканання гэтай пачэснай місіі служыць выступленне П. М. Машэрава 3 чэрвеня 1980 года на сходзе партыйнага актыву універсітэта «Аб неадкладных задачах Белдзяржуніверсітэта ў святле важнейшых праблем, якія стаяць перад рэспублікай».

На канферэнцыі выступілі сакратар партыйнай арганізацыі хімічнага факультэта Л. М. Аўсянка, дэкан фізічнага факультэта Э. М. Шпілеўскі, загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі І. І. Жбанкова, намеснік дырэктара НДІ ПФП А. У. Зянькевіч, сакратар камітэта камсамола П. І. Брыгадзін, дэкан юрыдычнага фа-

(Пачатак. Заканчэнне на 2-й стар.).

# З ПАЗІЦЫІ ВЫСОКАЙ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

**культэта В. Ф. Чыгір, прафесар гістарычнага факультэта Д. Б. Мельцар, загадчык вучэбных майстэрань М. І. Юзафовіч, першы сакратар Маскоўскага РК КПБ Б. А. Саўчанка, намеснік прарэктара па навукова-даследчай рабоце М. І. Казлоўскі, рэктар універсітэта акадэмік АН БССР У. А. Белы.**

**Прапануем у скарачэнні справаздачны даклад партыйнага камітэта БДУ імя У. І. Леніна, з якім выступіў А. П. Жук.**

Наша Радзіма знаходзіцца на адказным, вельмі важным этапе камуністычнага будаўніцтва, які характарызуецца завяршэннем дзесятай пяцігодкі. Камуністы, увесь калектыў універсітэта, як і ўсе савецкія людзі, ахоплены патрыятычным імкненнем — як мага больш паспяхова выканаць намечаныя планы, прынятыя мерапрыемствы па рэалізацыі гістарычных рашэнняў XXV з'езда роднай Камуністычнай партыі, XXVIII з'езда КПБ і з пачуццём выконваемага абавязку дастойна сустрэць XXVI з'езд КПСС.

Таму сёння мы абавязаны ясна і дакладна сказаць камуністам, што мы змаглі зрабіць і над чым яшчэ трэба ўпарта і настойліва працаваць, каб быць на вышыні прапанаваных партыяй задач і патрабаванняў сённяшняга дня.

Уся арганізатарская і выхаваўчая работа партыйнага камітэта, рэктарата, усяго калектыву была накіравана на падрыхтоўку спецыялістаў, якія, як указваў на сходзе партыйнага актыву нашага універсітэта П. М. Машэраў, павінны валодаць высокай палітычнай сталасцю і прафесійнай кампетэнтнасцю, сінтэзуючых у сабе глыбокія веды па ўсяму комплексу тэарэтычных і прыкладных дысцыплін з уменнем знаходзіць прынцыпова новыя рашэнні навуковых, сацыяльна-эканамічных і ідэалагічных праблем.

У гэтай сувязі партыйны камітэт, пярвічныя партыйныя арганізацыі на сваіх пасяджэннях і сходах абмеркавалі работу рэктарата, факультэтаў, кафедр і іншых падраздзяленняў. Прымаліся канкрэтныя меры па ліквідацыі выяўленых недахопаў.

У апошні час актыўна ўкараняюцца перадавыя формы і метады навучання з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, праграміраванага навучання. На кожным факультэце ёсць аўдыторыі, якія аснашчаны комплексам ТСН. Універсітэт з'яўляецца адной з галоўных ВНУ краіны па распрацоўцы і ўкараненню ў навучальны працэс аўтаматызаваных навучаючых сістэм.

Наогул па універсітэту ў вясновую экзаменацыйную сесію паспяховасць склала 93,7 працэнта сярод студэнтаў дзённага аддзялення. Высокая паспяховасць нашых студэнтаў не павінна быць прычынай для самазаспакоенасці, зніжэння эфектыўнасці работы партыйнай арганізацыі, усяго прафесарска-выкладчыцкага саставу па далейшаму ўдасканаленню навучальнага працэсу.

Важную ролю ў выхаванні высокакваліфікаваных спецыялістаў іграюць кафедры грамадскіх навук. Дзейнасць гэтых кафедр пастаянна знаходзіцца ў полі зроку парткома і рэктарата. Як паказаў аналіз, разам з пэўнымі поспехамі па камуністычнаму выхаванню студэнтаў у шэрагу выпадкаў узровень заняткаў па грамадскіх навуках не адпавядае яшчэ неабходным патрабаванням. Кафедры пакуль яшчэ не дабіліся глыбокага вывучэння студэнтамі твораў класікаў марксізму-ленінізму, дакументаў КПСС і міжнароднага камуністычнага руху. На семінарскіх занятках не заўсёды

ствараюцца ўмовы для творчага абмеркавання разглядаемых пытанняў. Усё гэта істотна паніжае актыўнасць студэнтаў, не садзейнічае выпрацоўцы ў іх самастойнага навуковага мыслення. Сур'ёзным недахопам у рабоце некаторых выкладчыкаў застаецца захапленне інфармацыйным бокам прадмета ў шкоду яго змястоўнаму і выхаваўчаму аспектам.

Грамадазнаўцам трэба вучыцца таму, каб зрабіць лекцыі і семінарскія заняткі даходлівымі, пераканаўчымі, яркімі, палітычна вострымі, захапляючымі ў лепшым сэнсе гэтага слова. А для гэтага неабходна, перш за ўсё, павысіць патрабавальнасць да якасці работы выкладчыкаў, не допускаць педагагічнага браку.

Выконваючы мерапрыемствы па рэалізацыі рашэнняў XXV з'езда КПСС, ва універсітэце за гады пяцігодкі было выпушчана (без уліку 1980 года) больш як 700 падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і метадычных распрацовак, якія аказваюць вялікую дапамогу студэнтам у засваенні вывучаемых дысцыплін. Напрыклад, дапаможнік па навуковаму камунізму для студэнтаў завочнага і вячэрняга аддзяленняў, які выдала кафедра навуковага камунізму, карыстаецца вялікай папулярнасцю ў студэнтаў універсітэта і іншых ВНУ.

Важны ўклад у рашэнне задач, якія намеціў XXV з'езд КПСС, заклікана ўнесці вышэйшая школа, яе высокакваліфікаваныя навукова-педагагічныя кадры. Шматлікія мерапрыемствы садзейнічалі далейшаму паляпшэнню НДР. Сёння ў лабараторыях і на кафедрах універсітэта склаліся арыгінальныя навуковыя школы ў галіне фізікі, матэматыкі, хіміі і іншых навук. Паспяхова выконваюцца многія важныя работы, створаны шэраг перспектыўных распрацовак, унікальных прылад, якія атрымалі шырокае выкарыстанне. Пастаянна ідзе работа па ўдасканаленню тэматыкі навуковых даследаванняў і канцэнтрацыі сіл вучоных універсітэта на важнейшых напрамках фундаментальных і прыкладных даследаванняў. Асаблівая ўвага звяртаецца на арганізацыю калектыўных і комплексных НДР, выключэнне з планаў малаперспектыўных і дробных тэм.

Вучоныя універсітэта прымаюць удзел у рэалізацыі 11 (з 60) рэспубліканскіх навукова-тэхнічных і эканамічных праграм, выконваюць асобныя заданні, якія ўваходзяць ў кола праблем саюзнага значэння. У мінулым годзе зарэгістравана адкрыццё прафесара кафедры ядзернай фізікі У. Р. Барышэўскага «З'ява ядзернай прэцэсіі спіна нейтронаў». Гэта першае адкрыццё, зробленае ў сістэме вышэйшай школы рэспублікі.

Выконваючы мерапрыемствы XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, укаранёны ў практыку вымяральнікі часовых інтэрвалаў высокай дакладнасці, новыя тыпы валокнаў і плёнак з палепшанымі якасцямі, якія прымяняюцца ў многіх галінах народнай гаспадаркі, сістэмы дыягнастычнага кантролю ротарных машын, авіярухавікоў, апаратура для кантролю за станам навакольнага асяроддзя, для аўтаматызацыі вымярэнняў і навуковых даследаванняў. Эканамічны эфект ад укаранення распрацовак у народную гаспадарку дасягнуў у 1979 годзе 8,5 млн. рублёў.

Значны ўклад унеслі вучоныя універсітэта ў выданне навуковых прац. Агульны аб'ём выданняў у 1979 годзе склаў 191 назву. За распрацоўку і выданне вучэбных дапаможнікаў для ВНУ «Вылічальныя метады вышэйшай матэматыкі» і «Вылічальныя метады» дацэнты В. В. Бабко і П. І. Манастырны ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР.

Паспяхова праводзяцца вучонымі універсітэта даследаванні па грамадскіх навуках. Большасць работ накіравана на рашэнне актуальных пытанняў, звязаных з узросшымі задачамі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і духоўнага развіцця грамадства, з праблемамі камуністычнага будаўніцтва.

Разам з тым неабходна падкрэсліць, што яшчэ не поўнасцю выкананы нашы мерапрыемствы па рэалізацыі рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ. Яшчэ недастаткова вядзецца работа па выкананню патрабаванняў XIX пленума ЦК КПБ аб пераўтварэнні універсітэта ў цэнтр навукі і культуры. У нас яшчэ нізкі эканамічны эфект ад адной укаранёнай распрацоўкі, сярэдні кошт гасдагаворных тэм, колькасць даследаванняў, якія выконваюцца па плану важнейшых работ. Асобныя факультэты і навуковыя падраздзяленні застаюцца ў баку ад патрэб народнай гаспадаркі. Слаба звязаны з прыкладнымі задачамі даследаванні, якія вядуцца на механіка-матэматычным факультэце. Гэты факультэт, маючы дастаткова высокі навуковы патэнцыял (112 чалавек прафесарска-выкладчыцкага саставу, 48 працэнтаў з якіх маюць вучоныя ступені і званні), практычна не ўдзельнічае ў выкананні работ па гасдагаворах з прадпрыемствамі.

Пакуль яшчэ нізкі ўзровень эканамічнай эфектыўнасці навуковых даследаванняў НДІ фізіка-хімічных праблем. Ён значна ніжэй сярэдняга агульнауніверсітэцкага ўзроўню, у той час як патэнцыяльныя магчымасці, ступень і ўзровень аснашчанасці абсталявання кафедр хімічнага факультэта і лабараторый НДІ значна вышэй у параўнанні з некаторымі іншымі структурнымі падраздзяленнямі універсітэта.

Ёсць немалыя прэтэнзіі і да вучоных-грамадазнаўцаў. Кафедры грамадскіх навук выконваюць ролю базавых, заклікаsuccessfully быць вядучымі ў комплексным даследаванні буйнейшых праблем грамадскага развіцця. Для такіх даследаванняў патрабуецца аб'яднанне намаганняў навуковых супрацоўнікаў самага рознага профілю: гісторыкаў, філосафаў, эканамістаў, юрыстаў, псіхолагаў, сацыёлагаў. Тым не менш многія нашы грамадазнаўцы па-ранейшаму працуюць разрознена, распыляюць свае сілы на дробныя тэмы.

Заклапочанасць выклікае работа аспірантуры. Эфектыўнасць яе дзейнасці ў апошні час некалькі знізілася. Некаторыя схільны тлумачыць гэта павышэннем патрабаванняў ВАК да дысертантаў. Але такое тлумачэнне аднабаковае.

Прычына хутчэй у іншым — як падбор аспірантаў, так і навуковае кіраўніцтва імі мае некаторыя хібы. Трэба своечасова шукаць таленавітую моладзь, паляпшаць навуковае кіраўніцтва аспірантамі.

За два апошнія гады аспірантуру БДУ скончыла 409 чалавек, з іх з абаронай дысертацыі 31 і з прадстаўленнем у савет 166. Гэта азначае, што толькі 47 працэнтаў аспірантаў закончылі выкананне дысертацыі ў планавы тэрмін. Гэта вельмі нізкі паказчык. Трэба адзначыць, што на некаторых факультэтах гэты паказчык значна ніжэй агульнауніверсітэцкага. Напрыклад, на геаграфічным факультэце толькі 18 працэнтаў аспірантаў заканчваюць дысертацыю ў тэрмін.

Яшчэ горш справы з абаронай доктарскіх дысертацый. У апошнія два гады ва універсітэце было толькі 5 доктарскіх абарон, а за мінулую пяцігодку больш 40 вучоных універсітэта пабылі ў водпуску для заканчэння доктарскіх дысертацый.




Важным напрамкам работы парткома стала авалоданне метадам комплекснага падыходу да пытанняў выхавання. Вядома, гэта патрабавала ад парткома, пярвічных партыйных арганізацый вывучэння праблем выхавання, пошукаў найбольш эфектыўных шляхоў іх рэалізацыі.

Абмеркаванне гэтых пытанняў паказала, што ў большасці пярвічных партыйных арганізацый ёсць і праводзяцца ў жыццё комплексныя планы камуністычнага выхавання. Глыбока прадуманымі, на наш погляд, і як паказала практыка, рэальнымі з пункту гледжання іх выканання з'явіліся планы ідэйна-выхаваўчай работы ў партыйных арганізацыях гістарычнага, філалагічнага факультэтаў.

Прадметам пастаяннага клопату парткома і пярвічных партыйных арганізацый з'яўляліся насценны друк і наглядная агітацыя. Павысіўся ўзровень іх ідэйнага зместу і мастацкага афармлення. У ліку лепшых на апошнім аглядзе-конкурсе былі адзначаны насценгазеты «Віта» (біяфак), «Журналіст» (журфак), «За навуку» (фізфак), «Гісторык» (гістфак), «Рошым любую задачу» (мехмат). У іх умела асвятляюцца пытанні вучэбнай, навукова-даследчай і палітыка-выхаваўчай работы, дзейнасць партыйных, камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацый.

У справаздачным перыядзе палепшыла сваю работу рэдакцыя шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт». Газета імкнецца трымаць у полі зроку актуальныя пытанні навучання і выхавання. Уведзена новая рубрыка «Гарызонты кафедры», атрымала адабрэнне ў чытачоў арганізаваная рэдакцыяй дыскусія «Калектыў: праблемы станаўлення». Ёсць і іншыя поспехі ў нашага рэдакцыйнага калектыву.

Асаблівай увагі патрабуе пастаноўка выхаваўчай работы ў інтэрнаце. Пэўны станоўчы вопыт работы ў гэтым напрамку назапасілі біялагічны і гістарычны факультэты. Так, на біялагічным факультэце стала традыцыяй, калі кафедры сумесна з камсамольскім актывам праводзяць культурна-масавыя мерапрыемствы — тэматычныя вечары, дыспуты, вечары пытанняў і адказаў, абмеркаванні кінафільмаў, твораў мастацкай літаратуры.

Аднак аналіз стану ідэйна-выхаваўчай работы ў інтэрнатах паказвае, што ў гэтай справе ёсць яшчэ шмат недахопаў. Выхаваўчая работа ў большасці з іх вядзецца пакуль бессістэмна, масавыя мерапрыемствы часам праводзяцца фармальна. Вельмі мала ў інтэрнатах клубаў па інтарэсах. У рабоце студсаветаў не адчуваецца ініцыятывы. Наведванне прафесарска-выкладчыцкім саставам інтэрнатаў нярэдка носіць фармальны характар. Некаторыя выкладчыкі загадзя не вызначаюць мэты свайго наведання інтэрната, а абмяжоўваюцца ў асноўным запісам у кнізе ўліку.

Зразумела, недахопы, аб якіх ішла размова ў справаздачным дакладзе, не павінны засланяць таго добрага, чаго дабіўся наш калектыў. Поспехі ў нас ёсць, і немалыя. Аб іх прыемна гаварыць. Аднак сёння неабходна сканцэнтраваць сваю ўвагу на ўпушчэннях і нявырашаных пытаннях з тым, каб паспяхова выконваць задачы па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і дастойна сустрэць XXVI з'езд КПСС і XXIX з'езд КПБ.

# Пастанова справаздачна-выбарнай партыйнай канферэнцыі універсітэта

Заслухаўшы і абмеркаваўшы справаздачны дэклад «Аб рабоце партыйнага камітэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з кастрычніка 1978 па кастрычнік 1980 года», партыйная канферэнцыя адзначае, што ўсю сваю работу ў гэты перыяд партком накіроўваў на выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, пастаноў вышэйстаячых партыйных органаў, першай партыйнай канферэнцыі. Вялікі ўплыў на ўсю дзейнасць парткома, рэктарата, пярвічных партыйных і грамадскіх арганізацый аказалі пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы» і ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў».

Другая партыйная справаздачна-выбарная канферэнцыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна **пастанаўляе:**

1. Работу партыйнага камітэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна прызнаць здавальняючай.

2. Партыйнаму камітэту, рэктарату, партыйным арганізацыям, дэканатам і кіраўнікам структурных падраздзяленняў і служб універсітэта мабілізаваць камуністаў і беспартыйных на дастойную сустрэчу XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, паляпшэнне ўсёй вучэбнай, навукова-даследчай і ідэйна-выхаваўчай работы.

3. Пастаянна ўдасканальваць арганізацыю вучэбнага працэсу, абнаўляць змест выкладаемых дысцыплін, прымяняць прагрэсіўныя метады і формы навучання, шырэй выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі навучання, прыцягваць да чытання лекцый вядомых вучоных АН БССР, НДІ рэспублікі, спецыялістаў народнай гаспадаркі.

**Павысіць ролю кафедры як галоўнага звяна, вызначаючага змест і адзінства вучэбнага, навуковага, выхаваўчага працэсаў. Перыядычна заслухоўваць загадчыкаў кафедр і выкладчыкаў на пасяджэннях парткома, рэктарата, партыйных бюро, саветаў факультэтаў і універсітэта па пытаннях удасканалення форм і метадаў навучання і выхавання студэнтаў. У другім семестры 1980—1981 навучальнага года на сумесным пасяджэнні парткома і рэктарата абмеркаваць пытанне аб рабоце кафедр хімічнага факультэта па павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.**

**Удасканальваць формы сувязі кафедр і факультэтаў з выпускнікамі універсітэта, улічваць іх крытычныя заўвагі, пажаданні ў сваёй практычнай рабоце, запрашаць для ўдзелу ў навуковых канферэнцыях.**

Парткому, рэктарату вывучыць стан арганізацыі і кіраўніцтва практыкай студэнтаў і абмеркаваць на савеце універсітэта ў першым семестры 1981—1982 навучальнага года.

4. Парткому, рэктарату прыняць дзейсныя меры па паляпшэнню арганізацыі вучэбнага працэсу са студэнтамі вячэрняга і завочнага аддзяленняў. Пастаянна ўдасканальваць формы і метады аказання ім індывідуальнай дапамогі, актыўней выкарыстоўваць новыя метады навучання, у поўнай меры ўлічваць спецыфіку вячэрняй і завочнай адукацыі і практычную работу студэнтаў.

**Да 1 лютага 1981 года дэканам факультэтаў прадставіць навукова-метадычнаму савету пры рэктарацё канкрэтныя планы па ўдасканаленню вучэбнага працэсу вячэрняга і завочнага навучання.**

**У лютым 1981 года правесці навукова - метадычную канферэнцыю прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта на тэму «Актуальныя пытанні павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў».**

5. Парткому, рэктарату, дэканатам, НДІ, пярвічным партыйным арганізацыям, кіруючыся рашэннямі XIX пленума ЦК КПБ і партыйнага актыву універсітэта ад 3 чэрвеня 1980 года, накіраваць асноўныя сілы і сродкі на даследаванне важнейшых праблем, якія стаяць перад народнай гаспадаркай рэспублікі, усямерна павышаць узровень і эфектыўнасць навуковых даследаванняў, дабівацца паскарэння ўкаранення закончаных НДР у народную гаспадарку. Працягваць распрацоўку навуковых даследаванняў на базе праграмна-мэтавага метаду планавання.

Умацоўваць творчыя сувязі з інстытутамі АН БССР, прамысловымі аб'яднаннямі і прадпрыемствамі на аснове дагавораў па вучэбна-навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву.

Факультэтам і кафедрам усебакова прааналізаваць і вывучыць стан навукова-даследчай работы студэнтаў, дакладна вызначыць перспектывы яе развіцця, шырэй выкарыстоўваць розныя формы прыцягнення студэнтаў да навуковага пошуку, ствараць усе ўмовы для таго, каб кожны будучы спецыяліст прайшоў школу навуковай творчасці.

6. Парткому, рэктарату, партыйным арганізацыям удасканальваць работу па падбору, расстаноўцы і выхаванню навукова - педагагічных кадраў. Пастаянна ўдзяляць увагу павышэнню іх ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, грамадска-палітычнай актыўнасці і прафесіянальнага майстэрства.

Павысіць якасць работы з рэзервам на замяшчэнне вакантных пасад прарэктараў, дэканаў, загадчыкаў кафедр, звярнуўшы асаблівую ўвагу на рэкамендацыю на гэтыя пасады маладых і здольных спецыялістаў.

**Паўней выкарыстоўваць усе формы павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў. Рэктарату ў 1980—1981 навучальным годзе абмеркаваць пытанне аб эфектыўнасці работы аспірантуры і падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі.**

7. Парткому, пярвічным партыйным арганізацыям працягваць удасканальваць формы і метады ўнутрыпартыйнай работы, умацаваць палітычную і арганізатарскую дзейнасць па здзяйсненню дырэктыў партыі і ўрада. Парткому пастаянна ўдасканальваць кіраўніцтва пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі і партгрупамі, усямерна павышаць іх баявітасць і мабілізуючую ролю ў рашэнні задач, якія стаяць перад калектывам універсітэта. Павышаць авангардную ролю камуністаў, выхоўваць іх у духу высокай адказнасці за даручаную справу. Пастаянна абмяркоўваць на пасяджэннях парткома і партыйных бюро пытанні аб дзейнасці пярвічных арганізацый па забеспячэнню авангарднай ролі камуністаў у вучэбнай, навукова-даследчай і палітыка - выхаваўчай рабоце. Абагульніць вопыт лепшай партыйнай пярвічнай арганізацыі па кіраўніцтву дзейнасцю партыйных груп.

8. Парткому, партыйным, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям прыняць меры па далейшаму разгортванню крытыкі і самакрытыкі, павышэнню яе дзейснасці.

**Строга ўлічваць крытычныя заўвагі і прапановы, сістэматычна інфармаваць камуністаў аб іх рэалізацыі. Уважліва вывучаць прапановы камуністаў і беспартыйных, ствараць умовы для шчырага абмену меркаваннямі, спыняць факты няправільнага рэагавання на прапановы камуністаў. Абмеркаваць на пасяджэнні парткома ў 1981 годзе стан крытыкі і самакрытыкі ў адной з партыйных арганізацый універсітэта.**

9. Парткому і пярвічным партыйным арганізацыям пастаянна ўдасканальваць кантроль і праверку выканання прымаемых рашэнняў і пастаноў вышэйстаячых партыйных органаў. Рэгулярна разглядаць гэтыя пытанні на партыйных сходах і пасяджэннях парткома, абмяркоўваць на семінарах сакратароў пярвічных партыйных арганізацый. Парткому абагульніць вопыт пярвічных партарганізацый па кантролю за выкананнем прымаемых рашэнняў.

10. Парткому, партыйным арганізацыям забяспечыць далейшае ўдасканаленне марксісцка-ленінскай адукацыі камуністаў, усіх супрацоўнікаў універсітэта. Пастаянна дабівацца павышэння якасці заняткаў у метадалагічных і тэарэтычных семінарах, у школах асноў марксізму-ленінізму, высокай актыўнасці слухачоў, цеснай сувязі вывучаемых праблем з практычнымі справамі калектыву, з задачамі народнай гаспадаркі. Да кіраўніцтва семінарамі і школамі прыцягваць найбольш падрыхтаваных выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Здзяйсняць сістэматычны кантроль за арганізацыяй партыйнай вучобы ў 1981—1982 навучальным годзе, абмеркаваць на пасяджэнні парткома пытанне аб вывучэнні ў сістэме палітычнай адукацыі матэрыялаў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ. Парткому, кафедрам грамадскіх навук распрацаваць сістэму мерапрыемстваў па аказанню дзейснай дапамогі партыйным пярвічным арганізацыям ва ўдасканаленні сістэмы палітінфарміравання студэнтаў.

11. Парткому, рэктарату працягваць работу па ўдасканаленню комплекснага плана палітыка-выхаваўчай работы са студэнтамі на ўвесь перыяд навучання з улікам задач, якія вынікаюць з пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў».

**Павышаць ролю і адказнасць кафедр грамадскіх навук у фарміраванні ў студэнтаў марксісцка-ленінскага светапогляду. Прадоўжыць практыку абмеркавання пытанняў выхаваўчай работы і вызначэнне мер па яе паляпшэнню на сумесных пасяджэннях кафедр і камітэтаў камсамола, падрыхтоўку і правядзенне палітыка-масавых мерапрыемстваў, узмацніць ідэйна - палітычную накіраванасць усіх форм вучэбнага працэсу.**

12. Парткому, рэктарату, партыйным арганізацыям, дэканатам, кафедрам і камітэту камсамола універсітэта павысіць эфектыўнасць грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў, фарміраваць у іх неабходныя якасці будучага выхаваceля і арганізатара, высокую палітычную і маральную культуру, пачуццё інтэрнацыянальнага абавязку, непрымірымыя адносіны да адхіленняў ад норм камуністычнай маралі, праяўленняў абыякавасці да вучобы, грамадскіх даручэнняў, недакладнасці, эгаізму.

Аказваць дапамогу студэнтам у набыцці грамадскіх прафесій. З гэтай мэтай стварыць на факультэце грамадскіх прафесій новыя аддзяленні, павялічыць кантынгент слухачоў. Камітэту камсамола разгледзець на сваім пасяджэнні пытанне аб стане і мерах паляпшэння работы факультэта грамадскіх прафесій у святле патрабаванняў пастановы сходу партыйнага актыву універсітэта ад 3 чэрвеня 1980 года.

13. Парткому, рэктарату, партыйным арганізацыям, дэканатам, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям пастаянна ўдасканальваць выхаваўчую работу ў інтэрнатах.

**Узмацніць састаў студэнцкіх саветаў, папоўніўшы іх аўтарытэтнымі і ініцыятыўнымі камуністамі і камсамольцамі. Актывізаваць работу пастаянна дзеючага семінара старшынь студсаветаў, клубаў па інтарэсах. Штогод праводзіць спаборніцтвы на лепшы інтэрнат, маральна і матэрыяльна заахвочваць пераможцаў.**

**Прадаўжаць практыку разгляду на пасяджэннях парткома і саветаў факультэтаў пытанняў ідэйна-выхаваўчай і культурна-масавай работы, быту, адпачынку студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах.**

14. Парткому, рэктарату прадоўжыць удасканаленне маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Пастаянна павышаць тэарэтычны ўзровень маральна-эстэтычнай адукацыі.

15. Парткому, пярвічным партыйным арганізацыям, праўленню таварыства «Веды» галоўную ўвагу ўдзяляць глыбокаму тлумачэнню марксісцка-ленінскай тэорыі, унутранай і знешняй палітыкі партыі і ўрада, актыўнаму і аргументаванаму раскрыццю палітыкі імперыялізму, паказу поспехаў савецкага народа ў будаўніцтве камунізму, пераваг сацыялістычнага ладу жыцця; прапагандаваць навукова-палітычныя, навуковыя і навукова-тэхнічныя веды. Прыняць актыўны ўдзел у прапагандзе матэрыялаў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда Кампартыі Беларусі.

**Партыйным бюро факультэтаў і структурным падраздзяленням у першым квартале 1981 года абмеркаваць на сваіх пасяджэннях пытанні ўдзелу навукова-педагагічных работнікаў у лекцыйнай прапагандзе.**

16. Парткому, рэктарату, партыйным, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям больш увагі ўдзяляць развіццю мастацкай самадзейнасці, дабіваючыся павышэння яе ідэйнага ўзроўню і выканаўчага майстэрства. Штогод праводзіць агляды мастацкай самадзейнасці, фестывалі палітычнай песні, агляды-конкурсы студэнцкіх агітбрыгад.

17. Парткому, пярвічным партыйным арганізацыям універсітэта пастаянна ўдасканальваць формы і метады кіраўніцтва камсамолам.

**Лічыць важнейшай задачай партыйных і камсамольскіх арганізацый ідэйна-палітычнае выхаванне студэнцкай моладзі, фарміраванне ў яе марксісцка-ленінскага светапогляду, савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму, непрымірымасці да праяў буржуазнай ідэалогіі. Асаблівую ўвагу звярнуць на выхаванне студэнтаў на прыкладзе жыцця і дзейнасці У. І. Леніна, на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях Камуністычнай партыі і савецкага народа.**

Партыйнаму камітэту ў справаздачным перыядзе разгледзець пытанне аб рабоце адной з партыйных арганізацый па кіраўніцтву камсамолам.

18. Парткому, пярвічным партыйным арганізацыям настойліва дабівацца далейшага паляпшэння работы прафсаюзных арганізацый, развіцця ініцыятывы, павышэння іх уплыву ў калектывах прафесарска-выкладчыцкага саставу, супрацоўнікаў і студэнтаў. Сканцэнтраваць увагу прафсаюзных арганізацый на ўдасканаленні сацыялістычнага спаборніцтва, усямерным развіцці камуністычных адносін да працы. Узмацніць кантроль за захаваннем тэхнікі бяспекі працы, размеркаваннем фондаў матэрыяльнага заахвочвання, жылля і іншых матэрыяльных даброт. З мэтай павышэння адказнасці камуністаў, якія працуюць у прафсаюзах, пярвічным партыйным арганізацыям не радзей аднаго разу ў семестр праводзіць з імі пасяджэнні, абагульняць перадавы вопыт.

19. Групам народнага кантролю сканцэнтраваць увагу на найболш важных напрамках работы калектываў універсітэта, забяспечваць арганічнае адзінства праверкі, прадухілення і выпраўлення недахопаў; рашуча весці барацьбу з фактамі парушэння працоўнай дысцыпліны і безгаспадарчасці.

**Партыйным арганізацыям перыядычна заслухоўваць на сходах пытанні работы груп народнага кантролю ў святле патрабаванняў пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым кіраўніцтве органамі народнага кантролю у Латвійскай ССР». Удзяляць сур'ёзную ўвагу рабоце школ народных кантралёраў.**

20. Парткому, рэктарату, партыйным арганізацыям, дэканатам, мясцкому і іншым грамадскім арганізацыям пастаянна паляпшаць быт і адпачынак выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта, удзяляць больш увагі развіццю спартыўнай і абаронна-масавай работы.

* * *

**Другая партыйная канферэнцыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна выражае ўпэўненасць у тым, што камуністы, прафесарска-выкладчыцкі састаў, супрацоўнікі, аспіранты і студэнты прыкладуць усе намаганні, каб паспяхова выканаць задачы, якія стаяць перад калектывам па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры, каб дастойна сустрэць XXVI з'езд КПСС і XXIX з'езд КПБ.**



Шырокі абмен думкамі на канферэнцыі працягваўся і ў час перапынкаў. Гэта сведчыць аб вялікай зацікаўленасці камуністаў да рашаемых праблем.

НА ЗДЫМКУ: камуністы П. І. ТКАЧОЎ, А. А. ЛОЙКА, А. А. ВОЛК, П. П. ШУБА, У. І. СІЛІН, М. Я. ЗАЙЦАЎ.

Фота М. ДУБОВІКА.

# Ружовы ранак

літаратурная старонка

## АЛЕСЬ ЦВЯХ



**Нарадзіўся ў 1955 годзе ў горадзе Мар'іна Горка Мінскай вобласці, зараз — студэнт 4-га курса факультэта журналістыкі. Друкаваўся ў часопісах «Маладосць», «Беларусь», альманаху «Дзень паэзіі-79». У 1981 годзе выдавецтва «Мастацкая літаратура» мяркуе выдаць кнігу маладога паэта «Ноч Мегаполіса».**

О, паэзія, вечны бег!..
Бег увысь, да глытка азону,
бег на стыках эпох і вех
праз бар'еры (новае? грэх!!!)
па замшэлых, гнілых шаблонах.
Крыўдна майстру, што
ні кажы,
калі граззю заплешчуць
азартна
бегуны на крутым віражы,
што кульгаюць трусцой
у заўтра.
Вер у зорны, свабодны бег,
без уздзечкі, не для
праформы,—
яркі ўзлёт ад бацькоўскіх
стрэх
да празрыстай, як ранні снег,
дасканаласці зместу і формы.
Ён пачаўся, твой першы бег.
Будзе суд, але хто там
суддзі?..
Хай яны падымаюць на смех,
што ляціш не так, як усе,
і прарочаць: апошнім будзе...
Прыйдзе час, і твой цуд-палёт
поймуць сотні, паўторыць —
не кожны...
...сцяўшы ўпарта засмяглы рот,
долу кінешся, як на дот,
засмяешся ад шчасця —
апошнім...

## ІКАРЫ XX

«Сон разума рождает чудовищ»
(Гойя)

...Смяяліся сытыя твары лакеяў,
што прагна сачылі з раскошных пакояў,—
а вецер, што з воблакаў крылы нам склеіў,
напоўніў іх свежым начным неспакоем;

і два ўцекачы летуценна ўзляцелі,—
і вылі радары ў пясках вечар цэлы:
— Над базай плывуць два нябесныя целы,
даволі адкрытыя, зручныя цэлі!..

крывавыя хмары грымелі ў зарніцах,
маланкі шыпелі, мільгалі змяіна,—
і ў цемры начной засталася граніца
між морам агню і Надзорнай краінай;

гіганцкае сонца, жыцця таямніца,
нам слала цяпла пурпуровыя хвалі...
над мёртвай планетай ішла навальніца,
і водгулле крылы твае калыхалі...

## САГА

...Вецер бадзяўся па дахах дамоў,
стылі таполі,
працягвалі рукі
ў вокны... І полымя тысячай моў
пела мне дзіўныя гукі.
Цені зляталіся лёгкай сцяной,
перапляталіся колеры, словы,—
словы забытай і згінуўшай мовы
падалі, не зразуметыя мной.
Фарбы заззялі, як захад у снах!..
...полымя грэла пакой летуценна,
і перапісчык, суровы манах,
нешта пісаў задуменна;
сціплы затворнік, сведка эпох,
тыя ж пытанні, тыя ж трывогі,—
свет звар'яцеў — не паможа і бог,
кожны сябе лічыць богам...
Полымя час паказала далей:
зал,
вітражы,
арбалеты і лукі...
Кат захаваны — букецік лілей
дораць крывавыя рукі!..
Сталі паленні гарою вугля,
водбліскі лашчыліся па каленях,
і паўставалі з начнога вугла
цені былых пакаленняў.
Ў садзе зімовым аголенасць дрэў
напаміналa пра зменлівасць свету...
...пелі мне песню агністыя нетры,
пелі пад ветру напеў...

## УЛАДЗІМІР ЛІСОЎСКІ



**Студэнт 4-га курса факультэта журналістыкі. Вершы пачаў пісаць з 1974 года. Друкуецца ўпершыню.**

## ШОССЕ

И кони, и люди, и автомобили
Кололи, топтали, давили все!
Шоссе извивалось от этой
боли.
Отчего же еще извиваться
шоссе?

## «ОСЕННЯЯ ПЕСНЯ»

...А я всегда в лесу теряюсь,
И кажется невольно мне,
Что я, как шорох, растворяюсь
Вот в этой желтой тишине.

Мне не до песен, не до свиста,
Кощунственных в такой тиши.
И, кажется, слетают листья
Не с дерева — с моей души.

Под небосводом серо-синим,
Когда вокруг то дождь, то мгла,
Мне так же зябко, как осинам,
Уже раздетым догола.

Становится легко и грустно,
Как будто в мире бытия
Я превращаюсь просто в чувство,
Забыв, что есть на свете я...

## ГРОЗА ПРОШЛА

Глыба-облако клубилось на голубом.
Голуби хлопали глупо в ладоши.
Верилось и в счастье, и в мечту,
и в любовь.
И город смеялся. Умытый. Хороший.

# НАТАШКА-ТАЕЖНІЦА



**Прапануем увазе чытачоў новае апавяданне М. ДУБОВІКА*. Вучыцца на 4-м курсе факультэта журналістыкі. Друкаваўся ў часопісах «Рабочая смена», «Вясёлка», рэспубліканскіх газетах.**

МАТАЦЫКЛ заглох перад самым пад'ёмам на сопку, калі да стойбішча — так студэнты жартам называлі месца дыслакацыі будатрада — заставалася каля двух кіламетраў.

Кузьма Іванавіч хуценька скокнуў з «Дняпра» і пачаў корпацца ў сваёй торхколавай машыне, але матор упарта не хацеў заводзіцца. Так, уласна кажучы, Кузьма Іванавіч, ён жа і Кузя — студэнт III курса філалагічнага факультэта — толькі і ўмеў, што падкачаць бензін у карбюратар. Але гэтай меры, на жаль, было яўна недастаткова, каб ажывіць матацыклетны рухавік. «Што ж рабіць?» — Кузя азірнуўся.

Наўкола маўкліва стаяла тайга. Высокія ліственіцы, кедры ўперамежку з беларускай хвояй высіліся магутнай сцяной і маўкліва сузіралі дарогу, якая серпанцінам вілася між невысокіх сопак, і юнака ў будатрадаўскай куртцы на ёй. «Каціць матацыкл у лагер? Ці выйдзе што? Надта ж цяжкі ён,— думаў Кузя. — Адраманатаваць не ўдаецца... Ісці ў пасёлак за дапамогай — далекавата». І тут ён заўважыў зусім недалёка ад дарогі, метраў мо за пяцьдзесят, як за ствавламі дрэў прасвечваліся сцены з паўдзесятка вагончыкаў. Такіх самых, у якіх жылі байцы іхняга атрада. Ля вагончыкаў стаяла некалькі машын. «Схаджу, — падумаў студэнт, — можа, дапамогуць».

Да вагончыкаў вяла даволі ўкатаная дарога, але людзей відаць не было.

— Гэй, гаспадары дома? — крыкнуў.

«Гэй, г-э-й, э-й», — разнесла крык рэха.

Здалося, вокліч толькі і чакалі, бо адразу ж адчыніліся дзверы аднаго вагончыка, і на парозе паявілася маленькая дзяўчынка.

— Добры дзень, — адразу прывіталася малая, з цікавасцю пазіраючы на госця. — Вы заблудзіліся?

Голас дзяўчынкі быў чысты, тоненькі, даверлівы, як шчабятанне нейкай дзівоснай птушачкі. Пачуўшы голас гаспадыні, адразу ж забрахаў і сабака, паказваючы ёй сваю аддданасць і тое, як ён пільна нясе службу.

— Кузя! Маўчаць. Не бачыш, у нас госці, — прыкрыкнула малая на шчанюка.

«Нічога сабе, надумаліся сабаку чалавечым імем назваць. Ды яшчэ і маім», — незадаволена падумаў студэнт.

Але ні ён, ні, пэўна, гэта таежная кветачка — дзяўчынка не вінаваты ў тым. А выйсце трэба шукаць.

— Не, я не заблудзіўся, — адазваўся Кузьма Іванавіч. — Проста зламаўся.

— Вой! — усклікнула дзяўчо. — Мабыць, зубы баляць ці жывот схапіў. Вы праходзьце ў пакой.

Студэнт шчыра засмяяўся.

— Твая маці, мабыць, доктар? Так? — спытаў у малой.

Яна здзіўлена глянула на хлопца.

— Так, — павольна прамовіла.— А вы ведаеце маю маму?

Кузьма Іванавіч хацеў адказаць адмоўна, але паглядзеў у вочы дзяўчынкі і зразумеў, што калі скажа «не», то будзе гэта яго памылкай. Кузю стала ясна, што дапамогі тут ён не знойдзе. З дарослых няма нікога, усе на працы. Але вось так проста завярнуцца і пайсці — ён адчуваў гэта — ужо не мае права. Яго запрасілі ў дом, паспачувалі. Трэба было падтрымліваць гутарку.

— Ведаю, ведаю, — паспешліва адказаў Кузя. І тут жа сам у сябе спытаў: «Навошта маніш?» — і па інерцыі дадаў:

— Цудоўны доктар твая мама.

— Канешне,— адразу згадзілася малая. — Мая мама не толькі добры доктар, але і выдатная гаспадыня, — дадала яна.

«Ну, гэта ўжо, мабыць, татава думка», — падумаў хлопец і спытаў:

— Так, напэўна, твой бацька гаворыць?

У малой акругліліся вочы.

— А вы і тату майго ведаеце?

Яна спусцілася з прыступак, пачала ласкава гладзіць сабаку-Кузю.

— Калі тата твой шафёр, дык ведаю.

— Але. У майго таткі вялікая, вось такая машына, — яна паказала, які ў таткі грузавік, шырока развёўшы рукі. — «МАЗ».

— Ведаю «МАЗ». Я там жыву, дзе іх робяць.

— Гэта далёка? — здзівілася малая.

— А ты ведаеш, дзе гэта?

Малая кіўнула.

— Гэта вунь за тою сопкай, потым будзе яшчэ тайга, затым рэчкі, а за рэчкамі горы. А за гарамі будзе вялікі, вялікі горад Масква, а потым будуць і «МАЗы».

— Мінск, — падказаў Кузя.

— Ага, — згадзілася малая і спытала:

— А там марожанага шмат?

— Шмат...

Тут Кузя злавіў сябе на думцы, што не спытаў, як завуць маленькую гаспадыньку. Вырашыў выправіць становішча.

— Наташка-таежніца завуць мяне, — ахвотна адказала дзяўчынка. — А ў Мінску трамваі ёсць?

— Ёсць, Наташка, і тралейбусы ёсць, і аўтобусы, толькі метро няма.

— Аўтобусы і ў нас ходзяць. А што такое метро?

— Гэта такія, Ната, трамваі, якія ездзяць пад зямлёю.

— А-а, — расчаравана адказала дзяўчынка. — І ў нас на БАМе тады метро ёсць. Толькі называецца па-іншаму.

— Яна наморшчыла лобік і, прыпамінаючы, павольна прагаварыла: — Тунель, і па ім паязды ходзяць. А ў нас яшчэ і ўсюдыходы ёсць.

**(Заканчэнне ў наступным нумары).**

* **Друкуецца ў скарачэнні.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
23 кастрычніка 1980 г.
АТ 15447 Заказ 1583

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ